УДК 633.82:58.006 (476.4-18)

Т. У. Сачыўка, канд. с.-г. навук, дац.;
В. М. Босак, д-р с.-г. навук, праф.; М. В. Навумаў (БДСГА, г. Горкі)

# НАПРАМКІ СЕЛЕКЦЫІ ВОСТРАСМАКАВЫХ КУЛЬТУР У БАТАНІЧНЫМ САДЗЕ БДСГА

Вострасмакавыя культуры вядомы чалавеку са старажытных часоў. Яны выкарыстоўваюцца ў розных галінах харчовай прамысловасці, у традыцыйнай і народнай медыцыне, у парфюмерыі і дэкаратыўным садоўніцтве і г.д.

Калекцыя вострасмакавых раслін Батанічнага сада Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі на дадзены момант налічвае 58 відаў (14 сямействаў і 40 родаў).

Даследаванне калекцыйнага матэрыялу вострасмакавых культур праводзіцца па наступных прыкметах:

– феналагічныя назіранні (усходы, бутанізацыя, цвіценне, паспяванне насення);

– біяметрычныя вымярэнні (вышыня раслін, памер ліставой пласцінкі, колькасць парасткаў і г.д.);

– марфалагічныя прыкметы (форма і шчыльнасць расліны, форма і афарбоўка лісця, даўжыня суквеццяў, афарбоўка венчыкаў і г.д.);

– улік ураджайнасці асноўнай прадукцыі і насеннай прадуктыўнасці;

– вызначэнне якасных паказчыкаў.

У выніку даследаванняў з калекцыяй вострасмакавых раслін выдзелены па комплексу гаспадарча карысных прыкмет, перададзены ў Дзяржаўнае сортавыпрабаванне і зарэгістраваны з уключэннем у Дзяржаўны рэестр сартоў Рэспублікі Беларусь з рэкамендацыяй для вырошчвання ў прысядзібных гаспадарках у 2014–2018 гг. сорт цыбулі шмат'ярусной (*Allium*×*proliferum* (*Allium cepa* × *Allium fistulosum*)) «Узгорак», сорт цыбулі духмянай (*Allium odorum* L.) «Водар», сорт барага (*Borago officinalis* L.) «Блакіт», сорт герані буйнакарэнішчавай (*Geranium macrorrhizum* L.) «Танюша», сорт пажытніка блакітнага (*Trigonella caerulea* (L.) Ser.) «Росквіт», сорт ісопа лекавага (*Hyssopus officinalis* L.) «Завея», сорт гарчыцы чорнай (*Brassica nigra* Koch) «Дарунак» і сорт руты духмянай (*Ruta graveolens* L.) «Смаляніца». Працягваецца праца па выдзяленню і рэгістрацыі ў сістэме Дзяржаўнага сортавыпрабавання мацярдушкі звычайнай (*Origanum vulgare* L.).